В. А. АДЗІНОЧАНКА
Гістарычны факультэт,
кафедра філасофіі

# АБ ВЫКЛАДАННІ ФІЛАСОФІІ З ПУНКТУ ПОГЛЯДУ ТЭХНАЛОГІІ

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Напэўна, для філосафаў, як і для гуманітарыяў наогул, сама пастаноўка пытання аб тэхналогіі выкладання філасофіі з'яўляецца

прафанацыяй. Бо, згодна з этымалогіяй, філасофія – гэта любоў да мудрасці (грэч. *phileo – любоў* і *sophia – мудрасць*). Гуманітарныя навукі тычацца вывучэння і тлумачэння чалавечай рэчаіснасці (лац. *humanus – чалавечы*). Тэхналогія ж разглядаецца як праява механістычнага светапогляду, яна вызначаецца як "сукупнасць (сістэма) правілаў, прыёмаў, метадаў атрымання, апрацоўкі альбо пераапрацоўкі сыравіны, матэрыялаў, прамежкавых прадуктаў, вырабаў, якія ўжываюцца ў прамысловасці" [1, с. 65]. Безумоўна, тут даецца вузкае азначэнне тэхналогіі, але, сапраўды, звычайна ў ёй бачаць нешта механічнае, узятае з галіны індустрыяльнай вытворчасці. Якая можа быць тэхналогія ў выпрацоўцы мудрасці? Таксама ўжыванне тэхналогій у працэсе ўзаемаадносін з другім чалавекам вядзе да разумення яго як нейкай сыравіны, якую можна апрацоўваць. Тым больш, што трагічны вопыт таталітарных рэжымаў XX ст. паказаў разбуральнасць сацыяльных тэхналогій у дачыненні да людзей, а зараз ўсё больш рэальнай робіцца небяспека маніпуляцыі з чалавечай прыродай праз біятэхналогіі.

Але калі ўжываць паняцце *тэхналогія* ў больш шырокім значэнні, то яе слушна разглядаць як "складаную рэчаіснасць, якая ў функцыянальным сэнсэ забяспечвае тыя ці іншыя цывілізацыйныя заваёвы (гэта значыць з'яўляецца механізмам навацый і развіцця), а па сутнасці ўяўляе сабой сферу мэтанакіраваных намаганняў…, якія істотна дэтэрмінуюцца шэрагам соцыякультурных фактараў" [1, с. 65]. Само слова тэхналогія паходзіць ад грэчаскага *techne – ўменне*. Апошняе патрэбна ў любой справе, калі мы хочам дасягнуць мэты. Напэўна, і выкладанне філасофіі можа быць разгледжана з гэтага пункту погляду. Студэнтаў патрэбна навучыць асновам філасофскіх ведаў. Тым больш, што тэхналагічны светапогляд аказаў значны ўплыў на фарміраванне сучаснай метадалогіі (ад грэч. *methodos – шлях даследавання* і *logos – вучэнне*). "Метадалогія – вучэнне пра метады навуковага пазнання і пераўтварэнне свету" [2, с. 302]. Зараз метадалагічная праца філасофіі не абмяжоўваецца аналізам пазнання, яна таксама разглядае схемы дзейнасці па ўзнаўленню грамадскага быцця. І таму метадалогія разглядаецца як адна з галін тэхналогіі.

Тэхналогія абумоўлена прадметам філасофіі і той сітуацыяй, у якой яна выкладаецца.

Філасофія азначаецца як "асаблівая форма пазнання свету, якая выпрацоўвае сістэму ведаў аб фундаментальных прынцыпах і асновах чалавечага быцця, аб найбольш агульных сутнасных характарыстыках чалавечага стаўлення да прыроды, грамадства і духоўнага жыцця ва ўсіх яго асноўных праявах" [3, с. 1127].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Для асэнсавання тэхналогіі выкладання філасофіі, трэба памятаць, што мы выкладаем не канкрэтнае філасофскае вучэнне, але распавядаем пра філасофію і яе асноўныя праблемы. У той жа час, выкладанне не зводзіцца толькі да гісторыя філасофіі, хаця апошняя займае ўсё большае месца ў курсе. Таксама студэнтам прапануюцца і веды аб асноўных структурах і заканамернасцях развіцця рэчаіснасці ў яе розных праявах. І тут трэба дакладна вызначць тыя філасофскія пазіцыі, з якіх гэта робіцца. Пакуль што, вельмі часта выкарыстоўваюцца запазычаныя з марксізму схемы. І ў гэтым мы бачым пэўную праблему. Бо, безумоўна, марксізм – адна са значных тэорый праз якія тлумачыцца грамадства. Яе палажэнні маюць актуальнасць і могуць быць ужыты для аналізу нашых сучасных праблем. Што тычыцца дыялектычнага матэрыялізму, як агульнай тэорыі рэчаіснасці, то, на наш погляд, шмат якія яго палажэнні не адпавядаюць сучаснаму стану навуковых ведаў і павінны быць радыкальна перагледжаны.

Адной з падстаў, на ягой грунтуецца выкладанне сучаснай філасофіі, з'яўляецца светапоглядная нейтральнасць. Існуе шмат філасофскіх кропак погляду, праз якія тлумачыцца свет. Таму мы павінны ўлічваць, што плюралізм у сучасных філасофскіх поглядах не толькі дапушчальны, але і непазбежны. Існуюць розныя філасофскія карціны свету. У той жа час, плюралізм не павінен прымаць радыкальны характар. Постмадэрнізм, які з'яўляўся філасофскай модай у канцы мінулага – пачатку нашага стагоддзя, і які грунтаваўся менавіта на метадалагічным плюралізме, разглядаў свет як хаос. Гэта прыводзіла да адмаўлення іерархіі каштоўнасцей: не прызнавалася розніца паміж дабром і злом, ісцінай і памылкай г. д. Пераадоленне перш за ўсё этычнага і ідэнтыфікацыйнага рэлятывізму, да якога вёў постмадэрнізм, з'яўляецца адной з задач сучаснай філасофіі. На ўзроўні ж студэнтаў, з якімі мы працуем, гнасеалагічны і этычны рэлятывізм праяўляецца ў форме скажонага індывідуалізму. Выказваюцца думкі, што кожны чалавек мае права на сваё бачанне свету, і таму нельга нікому навязваць веды і прынцыпы паводзін ў якасці больш ісціных. Але менавіта ў гісторыі філасофіі былі выпрацаваны тэхналогіі пераадоленне пункту погляду аб тым што "чалавек з'яўляецца мерай усіх рэчаў" і таму аб'ектыўнай ісціны не існуе.

Тут трэба ўзгадаць і звярнуць увагу студэнтаў на тое, што ўпершыню тэрмін *філасофія* ўжыў Піфагор, а яго разгорнутае тлумачэнне даў Платон. Ён пісаў, што мудрымі з'яўляюцца багі, а людзі могуць толькі імкнуцца да мудрасці. Людзей, якія гэтым займаюцца, Платон называў "філосафамі", а іх занятак – "філасофіяй". З гэтага можна зрабіць метадалагічную выснову, што ні адно з філасофскіх вучэнняў

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

не можа прэтэндаваць на канчатковае тлумачэнне рэчаіснасці, і любая праблема павінна абмяркоўвацца.

У якасці першай у гісторыі тэхналогіі гэтага абмеркавання мы можам разглядаць маеўтыку Сакрата. Само слова *маеўтыка* азначае *спавівальнае мастацтва*. Праз дыялог Сакрат спрабаваў дапамагчы сваім слухачам “нарадзіць” ісціныя веды. Гэты падыход выкарыстоўваўся ў гісторыі філасофіі не аднойчы. Зараз яго можна акрэсліць як “праблемнае навучанне”. Але прадумовай тых тэхналогій, якія выкарыстоўваў Сакрат у дачыненні да сваіх субяседнікаў, з’яўляецца вопыт абмеркавання праблем у дэмактарычных Афінах, а таксама прызнанне ў іх каштоўнасці тэарэтычных ведаў.

Асаблівасцю нашай сітуацыі з’яўляецца тое, што філасофія выкладаецца на першым-другі курсах, і ў маладых людзей, якія толькі што скончылі школу, як правіла, не сфарміраваныя навыкі разважанняў. Таксама яны знаходзяцца ў патоку інфрмацыі, якую ім вельмі цяжка асэнсаваць. Апроч таго, адной з сучасных праблем зрабілася камерцыялізацыя адукацыі. “Адукацыя і выхаванне незаўважна для грамадскасці падмяняецца тэрмінам “прадастаўленне паслуг студэнтам і навучэнцам”, а студэнты і навучэнцы называюцца не студэнтамі і навучэнцамі, а “спажыўцамі паслуг” [4, с. 89–90].

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

Трэба сказаць шчыра, што цяперашні час неспрыяльны для філасофіі як вучэбнага прадмета. Колькасць адведзеных на яе вывучэнне гадзін пастаянна скарачаецца. Яшчэ ў 2010 г. яна рэальна складала 90 гадзін, потым 68, а зараз зведзена да 42 (22 гадзіны лекцый і 20 семінараў). Безумоўна, што за такі час немагчыма якасна расказаць, нават у самых агульных рысах, пра асноўныя этапы развіцця філасофіі і філасофскія праблемы. Апроч таго, у гэтым годзе у якасці эксперымента філасофія на непедагагічных спецыяльнасцях была аб’яднана ў адзін модуль з псіхалогіяй з сумесным экзаменам. Відавочна, што гэта розныя прадметы, і іх спалучэнне не спрые вывучэнню ні таго, ні другога. Апроч таго, студэнты фактычна рыхтуюцца да экзамену па двум розным прадметам, што, як паказаў вопыт гэтага года, адмоўна ўплывае на якасць іх ведаў.

Але ў той жа час можна канстатаваць актуальнасць філасофскіх даследаванняў для нашага сучаснага грамадства. Мы можам нават сказаць, што жывем у вельмі спрыяльны час для філасофіі. Бо тыя праблемы, якія зараз перад намі паўсталі, патрабуюць філасофскага асэнсавання. Гэта праяўляецца і ў пытаннях і выказваннях студэнтаў.

Таксама, на нашу думку, трэба выпрацоўваць беларускі пункт погляду на тыя праблемы, якія патрабуюць філасофскага асэнсавання. Характэрнай рысай сучаснага беларускага грамадства з’яўляецца тое,

што яно знаходзіцца ў працэсе трансфармацыі. Вучоныя адзначаюць, што «аналіз працэсаў трансфармацыі як сістэмы перамен ставіць перад даследчыкамі, магчыма, галоўнае пытанне аб тым, у якой ступені рэформы на іх завяршаючай стадыі ўлічваюць нацыянальныя адметнасці, спецыфіку кожнай краіны, яе традыцыі і культуру" [5, с. 21]. Такім чынам, неабходна не толькі філасофскі асэнсаваць месца Беларусі ў свеце, але таксама і вызначыць, які сэнс маюць такія паняцці як "культура", "цывілізацыя", "свабода", "чалавек", "грамадства" і г. д. ў дачыненні праблем менавіта нашай гісторыі і сучаснасці. Таксама пры распрацоўцы канцэпцыі нашай культурнай ідэнтычнасці трэба ўлічваць думкі дзеячоў менавіта нашай культуры, а не якой-небудзь іншай. Што тычыцца праблемы выкладання філасофіі па-беларуску, то, як паказвае наш уласны вопыт, яна павінна быць часткай агульнага працэсу тэхналогіі выпрацоўкі беларускага культурнага светапогляду.

РЕПОЗИТОРИЙ ГГУ ИМЕНИ Ф. СКОРИНЫ

**Літаратура**

1. Новая философская энциклопедия: в 4 т. Т. III / Научно-ред. совет: В. С. Степин [и др.]. – М. : Мысль, 2010. – 736 с.

2. Беларуская энцыклапедыя: у 18 т. Т. 10 / Рэдкал. Г. П. Пашкоў [і інш.]. – Мн. : БелЭн, 2000. – 544 с.

3. Всемирная энциклопедия: Философия / Главн. науч. ред. и сост. А. А. Грицанов. – М. : АСТ, Мн. : Харвест: Современный литератор, 2001. – 1312 с.

4. Новик, Е. К. О Болонском процессе и действительных проблемах образования / Е. К. Новик // Социология, 2013. – № 3. – С. 83–97.

5. Данилов, А. Н. Постсоветская трансформацыя: уроки для будущего / А. Н. Данилов // Социология, 2005. – № 4. – С. 19–27.